Паважаныя калегі!

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ**
**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ**

запрашаюць прыняць удзел у Міжнароднай навуковай канферэнцыі

# МІНСК І МІНЧАНЕ: ДЗЕСЯЦЬ СТАГОДДЗЯЎ ГІСТОРЫІ (ДА 955-ГОДДЗЯ ГОРАДА)

Плануемае поле канферэнцыі:

- Менск старажытны (XI – XIII стст.);
- у складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай;
- цэнтр губерні Расійскай імперыі;
- горад у віхурах войн і рэвалюцый;
- Мінск – сталіца Савецкай Беларусі і Рэспублікі Беларусь;
- знакамітыя мінчане;
- турыстычны патэнцыял сталіцы Беларусі.

Час правядзення канферэнцыі: **9 – 10 верасня 2022 г.**

Плануемае месца правядзення канферэнцыі: **Мінск, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі**.

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца да **5 жніўня 2022 г.** па электроннай пошце **rogneda_o@mail.ru**.

У заяўцы паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, яго навуковая ступень і званне, назва даклада, назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык, кантактны тэлефон, e-mail. Студэнтам, магістрантам і аспірантам разам з заяўкай неабходна даслаць тэзісы даклада (да 2000 знакаў) і водгук навуковага кіраўніка. Замежных удзельнікаў просім паведаміць пра неабходнасць візавай падтрымкі.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі. Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будзе даслана да **15 жніўня 2022 г.**

Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны. Патрабаванні да тэкстаў дакладаў: да **1 лістапада 2022 г.** у аргкамітэт дасылаецца электронны варыянт не болей за 30 000 знакаў, спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання апускаюцца.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская, руская, польская.

**Кантакты:** Рагнеда Анатольеўна Аляхновіч, 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Тэл. (+375 17) 378-14-09, факс (+375 17) 379-18-34, e-mail: rogneda_o@mail.ru.

Камандзіровачныя выдаткі за кошт камандзіруючага боку.

Аргкамітэт